Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 24 Вільня, Пятніца 10 Чэрвяня 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Беларуская школьная трагедыя.

Урэшце сталася тое, аб чым даўно ўжо хадзілі чуткі, чаго найбольш беларускае грамадзянства баялася і прад чым мы яго прасьцерагалі.

Куратар Віленскага Школьнага Вокругу 19.V. сёл. г. прыслаў Бацькаўскаму Камітэту Віл. Бел. Гімназіі паперу, у якой прапануе з гэтай гімназіі ўтварыць роўналеглыя клясы з беларускай мовай навучаньня пры Віленскай польскай гімназіі ім. Славацкага і ўсю маемасьць беларускай гімназіі перадаць дзяржаве. Такую-ж самую прапазыку атрымала і Беларуская Гімназія ў Наваградку.

Аказваецца такім чынам, што алярм наш у гэтай справе быў слушны і „białorusini-polacy" з „Бел. Звону" аблівалі нас за гэта гразёй і даказвалі, што польскія школьныя ўлады нічога дрэннага беларускім гімназіям зрабіць ня думаюць, — мусіць толькі спаўняючы Каінавую роль адносна беларускай школы.

27.V. быў склíканы надзвычайны агульны сход Бацькаўскага Камітэту Віл. Бел. Гімназіі. На парадку дня—прапазыцыя Куратара. Прад тым як прыступіць да разгляду самай прапазыцыі, сход прадусім загадаў Бацькаўскаму К-ту выступіць з так зв. „Цэнтрасаюзу", староньнікаў польска-беларускай угоды. Загад гэты сход абапёр на матывах узгадаваўчых, каб моладзь ня была жырам для „нашых" палітыканаў, а так-жа і на матывах нацыянальна-грамадзкіх, каб паказаць, што — больш чым угадовы — „Цэнтрасаюз", які сваей палітыкай давёў гімназію да таго, што ей польскія ўлады зрабілі гэткую прапазыцыю, а так-жа давёў гімназію да нябывала сумнага палажэньня з боку ўзгадаваўчага, — ад гімназіі павінен быць адсунуты як найдалей.

Пасьля гэтай пастановы была прынята аднагалосна рэзалюцыя, я ая адкідае прапазыцыю Куратара і сьцьвярджае няўхільную волю беларускага грамадзянства мець сваю ўласную родную сярэднюю школу. Важная гэта пастанова прынята, кажам, аднагалосна. Але-ж што з таго, калі „нашы" „białorusini-polacy" — маем падставы так цьвердзіць! — вядуць падвойную ігру: прад грамадзянствам робяць і кажуць адно, а прад польскімі ўладамі сусім што іншае.

2.VI. у „Kurjery Wilenskim" паявіўся „вывяд" Куратара, у якім ён бароніць сваей беларусам прапазыцыі, шырока тлумачачы аб тых „дабрадзействах", якія з гэткай „рэформы" бел. гімназіі для беларусаў вынікаюць, а так-жа падчорківае, што ня гледзячы на зьлiквідаваньне Дзяржаўнай Вучыцельскай Сэмінарыі ім. Фр Багушэвіча, якая мела прыгатаўляць беларускіх вучыцялёў для пачатковых школ, справа гэтага прыгатаваньня і так ёсьць быццам „zupełnie zadawalająca". Ведама, „zadawalająca", але для каго?

Таго-ж 2.VI. адведала Куратара дэлегацыя Бацькаўскага К-ту Віл. Бел. Гімназіі, уручыла яму рэзалюцыю Агульнага Сходу і прасіла яго не касаваць самастойнасьці Віл. Бел. Гімназіі, пакінуць яе і надалей у руках самых-жа беларусаў і даць ей з дзяржаўнага скарбу, у якім нямала ёсьць і мазалістага граша беларускага, адпаведныя сумы на яе існаваньне. Куратар аднак бараніў свайго становішча, асабліва падчорківаючы, што забраўшы Віл. Бел. Гімназію ў рукі дзяржавы лягчэй можна будзе справіцца з камунізмам, які ўсьцяж пралазе ў беларускую школу, чаго сьвежым доказам зьяўляецца апошняя „маёўка". А з „маёўкай" было вось як.

22.V. сёл. г.—была гэта нядзеля, нейкія цёмныя адзівкі розным ашуканскім спосабам замавілі беларускую школьную моладзь з гімназіі і з Сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча за места на „маёўку". На „маёўцы" аказаліся нейкія нязнаныя асобы, з якіх адны прамаўлялі да моладзі ў духу камуністычным, а другія больш бойкіх з моладзі зручна фатаграфавалі. Аб гэтым усім данесьлі дырэктарам сэмінарыі і гімназіі „прыпадковыя" людзі. У рэзультаце „маёўкі" выкінулі з сэмінарыі 3 вучняў і 1 вучаніцу, а з гімназіі 2 вучняў і некалькіх чалавек з гімназіяльнага інтэрнату, як камуністаў і як ў камунізьме падазроных. Як так магло стацца, што моладзь выйшла з інтэрнатаў бадай на цэлы дзень, а кіраўнікі інтэрнаўтаў нічога аб гэтым ня ведалі і ня цікавіліся, дзе гэта моладзь дзелася — гэта ёсьць тайнай узгадаваньня ў гэтых інтэрнатах.

З гэтага агульнага апісаньня ў парадку хронолёгічным сьвежых трагічных падзеяў беларускай школы, астаецца нам яшчэ зрабіць апошнія высновы.

Вось-жа прадусім горача заклікаем нашу моладзь, каб не падавалася ніякім нашэптам розных цёмных адзівак, якія часта зьяўляюцца звычайнымі безадказнымі гравакатарамі або з боку камуністычнага, або з якога іншага і якія аднолькава імкнуцца да разбурэньня беларускай школы.

Зварочваем так-жа ўвагу і польскіх школьных уладаў на той ненармальны факт, што яна дапускала і дапускае да кіраўніцтва беларускай школы тыя асобы, якія ня ўмеюць і ня хочуць аддзяляць школу ад палітыкі. Клясычным прыкладам можа тут служыць дырэктар Дзярж. Вуч. Сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча, за часоў дырэктарства якога ў Віл. Бел. Гімназіі сярод гімназіяльнай моладзі разьвіваўся камунізм, а які цяпер вуча моладзь сэмінарыйную *„лёяльнасьці"* да Польшчы. Ня трэба быць пэдагогам, каб ведаць, што гэткіх асоб да кіраўніцтва школы дый агулам да школы дапускаць ня можна, бо слову іх моладзь ніколі не паверыць і зробіць усё наадварот да таго, чаго яны вучаць. Апошняя „маёўка" ёсьць найлепшым гэтага доказам.

З другога-ж узноў боку існаваньне ў Віл. Бел. Гімназіі — аб чым голасна гавораць і вучні і грамадзянства — сярод вучняў агентаў даношчыкаў, з чаго ані дырэкцыя гімназіі, ані ўлады школьныя нічога сабе ня робяць, да ўзгадаваньня пэўне-ж не прычыняецца.

Усё вышэйсказанае гавора проста аб трагічных варунках узгадаваньня нашай моладзі і аб трагічным лёсе агулам і нашай школы і нашай моладзі.

Вось-жа горача заклікаем усё беларускае грамадзянства, а прадусім бацькоў і апякуноў, як вучняў Віленскай, так і Наваградзкай гімназіяў, дружна выступіць усімі магчымымі і легальнымі спосабамі ў абароне самастойнага існаваньня апошніх загрожаных беларускіх гімназіяў, а так-жа на абарону адпаведнага, здаровага ў іх узгадаваньня.

Мала прачытаць газэту самому:
т р э б а
яе прачытаць сабраным суседзям разам

Нацыянальны элемэнт у царкоўным жыцьці.

Усё больш і больш грамадзянства зварочвае ўвагу на становішча Праваслаўнае Царквы ў Польшчы. Гэта сьведчыць аб тым, што Царква зьяўляецца фактарам ня толькі рэлігійнага, але нацыянальна-грамадзкага і дзяржаўнага значэньня. Аднак-жа пры ўнармаваньні царкоўнага жыцьця павінны паважна брацца пад увагу галасы толькі тых, у кім рэлігійнасьць пераважае ўсе іншыя пытаньні.

У апошнюю пару ў польскіх часопісях „Słowo", „Kurjer Wileński" і расейскай „Наше Время" зьмешчаны былі вельмі характэрныя артыкулы на тэму аб значэньні нацыянальнага элементу ў жыцьці Праваслаўнае Царквы.

У №№ 87 і 113 „Kur. Wil." абасновава праводзіцца пагляд, што бязладзьдзе ў сучасным царкоўным жыцьці ў Польшчы залежыць ад чужога для верных Царквы — беларусаў і ўкраінцаў — і непрытарнаванага да жыцьця гэтых народаў расейскага духавенства, займаючага кіраўнічыя становішчы як у епархіях, так і ў прыходах.

Паказваючы на амаральнасьць значнае часткі гэтага духавенства, аўтор цьвердзіць, што яно перадусім мае на мэце шкодную для рэлігійнага і нацыянальнага жыцьця беларускага і ўкраінскага насельніцтва русыфікацыю, праз што праваслаўныя беларусы і ўкраінцы трацяць давер да Царквы, бачачы ў ёй ня Божую, а зямную ўстанову, якая служыць для палітычных мэтаў „будучае Расеі".

„Царква, піша „Kur. Wil.", сталася ўстановай бяз верных, нейкай інстытуцыяй для рэгістрацыі актаў стану, а з духавенства вытварыўся тып фармальна лёяльнага, але безкарыснага для верных і дзяржавы ўрадаўца". Вынікам такога палажэньня, паводле цьверджаньня „Kur. Wil.", зьяўляецца страшэнны заняпад рэлігійнасьці сярод праваслаўных беларусаў, а ў сувязі з гэтым — пашырэньне між імі камунізму, бязбожжа, амаральнасьці, праступства і г. д.

Прыводзячы факты разбураючыя духовае жыцьцё праваслаўнага народу, хцівасьці кіруючых епархіямі Кансысторыяў, аблажыўшых цэрквы вялізарнымі падаткамі, „Kur. Wil." прыходзіць да вываду, што так неабходная направа духовага жыцьця праваслаўных беларусаў магчыма толькі тады, калі замест чужынцаў кіраўнічыя мясцы ў епархіях і ў прыходах будуць заняты не безпрынцыповымі расейцамі, гатовымі ў кожную хвіліну, дзеля кар'еры і асабістае карысьці, зьмяніць сваю нацыянальнасьць, а ведамыя беларускаму і ўкраінскаму грамадзянству запраўдныя прадстаўнікі і сыны гэтых народаў.

На артыкул у № 87 „Kur. Wil." адклікнулася „Наше Время". Расейская часопісь не пярэчыць вывадам „Kur. Wil.", з сумам прызнае праўдзівасьць — вытраўляючай з душаў верных усякую рэлігійнасьць дзеяльнасьці і захаваньня сучасных кіраўнічых органаў духовага жыцьця і толькі асьцярожна дадае, што справа ўплыву духаўніка на верных ляжыць ня выключна ў нацыянальнай лучнасьці, але і ў моралі духаўніка.

Аднак-жа гэтая думка не зьяўляецца новаю, бо-ж „Kur. Wil.", паклікаючыся на „Воскресное Чтеніе", з асаблівым націскам падкрэсьлівае недастачу пашаны і ўвагі з боку сучаснага духавенства нават пры выконваньні ім Найсьвяцейшага Таінства Прычашчэньня, а гэта хіба найболей характэрызуе сучаснае расейскае духавенства. Такім

чынам „Нашему Времени“, якое заўсёды бароніць сучасны склад расейскага духавенства, астаецца толькі сумаваць аб яго дзеяльнасьці, асабліва ў адносінах да кіраўніцтва Віленскай епархіяй, і запярычыць „Kur. Wil.“ яно пазбаўлена магчымасьці.

Зусім іншае становішча да гэтага пытаньня заняло віленскае „Słowo“, хоць і не паказваючы на „Kur. Wil.“, але бязумоўна ў адказ на яго артыкулы зьмясьціўшае ў сябе некалькі артыкулаў. Дарма траціў-бы час той, хто хацеў-бы знайсьці ў віл. „Słowie“ імкненьне да паглыбленьня рэлігійнасьці ў народзе. Сьмехатворна, але згодна з сваей абшарніцкай ідэолёгіяй, „Słowo“ цьвердзіць, што ў жылах расейскага духавенства на Беларусі цячэ польская шляхоцкая кроў і дзеля гэтага выказвае радасьць на хуткае яго апалячаньне, а праз яго — і праваслаўных беларусаў.

Дык вось, дзеля спалянізаваньня праз расейскае духавенства беларускага народу, „Słowo“ выкрыла ў жылах гэтага духавенства шляхоцкую кроў.

Далей „Słowo“ піша: „Выдатныя прадстаўнікі таго (расейскага) духавенства разумеюць, што для існаваньня праваслаўя ў Польшчы, для заняцьця раўназначнага становішча з Каталіцкім Касьцёлам, Праваслаўе павінна спалянізавацца. Ужо цяпер маем палякоў праваслаўных, якія дамагаюцца навучаньня рэлігіі ў польскай мове, ня знаюць нават мовы расейскай... Ня выключана магчымасьць, што некаторыя цэрквы будуць пераходзіць на польскую мову ў Багаслужэньні.

„Што да беларусізацыі, то лічым яе шкоднай і небясьпечнай ідэяй. Беларускі рух, дагэтуль слабы, набярэ сілы, ...калі дазволім ім збеларусізаваць Праваслаўе.. Ведаем, што праваслаўныя беларускія духаўнікі бралі ўдзел у рэвалюцыйнай грамадзе. Не падлягае сумліву, што ў выпадку назначэньня беларускіх біскупаў на нашых паўночна-ўсходніх землях, розныя кар'ерысты зробяцца беларусамі і беларускімі дзеячамі.

„Украінская нацыянальнасьць нарадзілася ў уніяцкай Царкве. Нацыянальнае адраджэньне ліцьвіноў вышла з клябаніяў. Дзеля чаго маем памагаць беларускаму нацыянальнаму руху, ствараючы для яго беларускую Царкву“?...

Як бачым, для „выдатнага“ расейскага духавенства „Słowo“ надрукавала праграму, сэнс якой наступны: „палянізуйце беларусаў і ўкраінцаў і душэце праявы ў іх рэлігійнасьці на грунце нацыянальным“. Чужое да беларусаў і ўкраінцаў духавенства заклікаецца да зьвярынае ненавісьці да беларусаў і ўкраінцаў, якія становяць 95 прац. верных Праваслаўнае Царквы ў сучаснай Польшчы.

Да большага цынізму трудна дагаварыцца.

У № 92 „Słowo“ з захопленьнем піша аб „вельмі добрым“ палажэньні Праваслаўнае Царквы ў Польшчы, аб аўторытэце іерархіі, яе ўладзе, якою яна не карысталася у б. Расеі. У доказ аўторытэту паклікаецца на кардынальскі тытул Мітрапаліта Дзіанісія — „Эміненцыя“.

Але паўстае пытаньне: ці дае гэты тытул Мітрапаліту позытыўную магчымасьць у кіраўніцтве Царквой? Ці можа Мітрапаліт свабодна пасылаць сьвяшчэньнікаў для задаволеньня рэлігійных патрэбаў верных, дзе яны просяць аб гэтым? Ці можа Мітрапаліт абараніць сьвяшчэньніка, калі яму за нейкую нявытлумачаную „нелёйяльнасьць“ дадуць „усуненьне“ з прыходу? Ці мае магчымасьць Мітрапаліт так паставіць справу Царквы, каб дзяржава заключыла з Ёй дагавор, як гэта зроблена з Касьцёлам Каталіцкім?

Хвалячы сучаснае расейскае духавенства ў Польшчы за яго хуткую палянізацыю, „Słowo“ выказвае надзею, што маладое духавенства, гадунцы сучасных духоўных школаў, будзе палянізацыю вясьці больш энэргічна. Ці павядзе яно, і з якім пасьпехам, палянізацыю — сумліўна. Каб вясьці якую-небудзь грамадзкую працу, неабходна карыстацца сярод народу адпаведным уплывам. Калі ходзіць аб Віленскую Дух. Сэмінарыю, то ў ёй не прышчапляецца любоў да беларускага народу, а наадварот, і выхаваныя ў такім духу сьвяшчэньнікі могуць толькі ў лепшым выпадку спалянізавацца самі, а спалянізаваць беларускае насельніцтва яны ня здолеюць. На вялікі жаль, такія духаўнікі ня здолеюць выхаваць народ і на падставах хрысьціянскае моралі.

„Słowo“ падае, што ёсьць праваслаўныя, якія дамагаюцца навучаньня рэлігіі ў польскай мове. Калі польская мова зьяўляецца для гэтых праваслаўных роднай, дык гэта зразумела. Але пару гадоў таму духавенства і Маладэчанскага Благачыньня вынесла пастанову аб навучаньні дзяцей рэлігіі ў польскай мове.—Ці не за гэта „Słowo“ знайшло шляхоцкую кроў у жылах расейскага духавенства?—Мімаволі прыпамінаецца факт, калі перад сусьветнай вайной у адным нямецкім гарадку нямецкія ўлады змусілі польскіх дзяцей маліцца ў нямецкай мове. Якое абурэньне выклікаў тады загад мясцовай нямецкай улады! Але-ж тады былі іншыя часы, і рабілі гэта немцы...

Рыдз.—віч.

(Працяг будзе).

„Беларуская Крыніца“ выходзіць у месяцы чэрвені — 10, 20 і 29.

Канцэрт беларускай песьні.

У мін. суботу 4 г. м. ў залі Віл. Гандлёва-прамысловага клюбу (вул. Міцкевіча 33 а) адбыўся доўгачаканы Канцэрт беларускай песьні, зладжаны стараньнем Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні, а кіраваны выпрабаванай і дазнанай рукой рэгента грам. Р. Шырмы. Само зьявішча канцэрту, а не канцэрт-вечарыны з „традыцыйнымі“ „буфэтам, конфэтті і скокамі да раніцы“, у жыцьці Віленскіх беларусаў рэч ня толькі што няштодзенная, але наагул бадай першая ў сваім родзе.

Рызыкам з боку гаспадароў і выканаўцаў канцэрту было таксама падабраньне позна-вясьнянай пары, калі ўсё жывое імкнецца з муроў места на ўлоньне вольнай прыроды. Да таго ў тую ж гадзіну адбываўся ў Вільні юбілейны канцэрт Ст. Манюшкі, які шырокай рэклямай цягнуў да сябе ўсіх ахвотнікаў мілагучнасьці вокальных і інструмэнтальных тонаў... Гэта малая выбарка перашкодаў вонкавых. Унутры-ж: будаваньне хору ад асноў, з элемэнту больш як рабога (у значэньні музыкальнага прыгатаваньня), нездысцыплінаванага, адсутнасьць беларускага музыкальнага асяродка, „гарачы час“ у гаспадароў канцэрту — студэнтаў, з прычыны набліжаючагася канца школьнага году, крайнае безграшоўе і г. д. і г. д. — усё гэта наказвала арганізатарам „сем разоў адмерыць, каб раз перарэзаць“. І перарэзалі добра!

Выканана было, паводле праграмы, 17 нумароў, харавых і сольёва-вокальных, у апрацаваньні: М. Анцава, К. Галкоўскага, В. Багдановіча, Грэчанінава, Леантовіча і інш. Найлепш удаліся песьні народныя і публіка за іх дарыла выканаўцаў незмаўкальнымі апплёдысмэнтамі (воплескамі). Цяжэй крыху давалася выкананьне партыяў харавых, на што трэба большай хіба сілы. Для выкананьня квартэту хорам („Месяц“ — Купалы-Галкоўскага) трэба чысьцейшых і самапэўнейшых галасоў. Лічбовы склад хору, ў адносінах да разьмераў залі, быў крыху за малы, асабліва пры падзеле на хоры жаночы і мужчынскі. Бас за шмат даваўся чуць пры ўсплываньні ў вышэйшыя тоны, тэнару-ж трэба пажадаць большай выразістасьці. Самазадаволеньне—рэч добрая, але не на адчыненай сцэне... Урэшце новая апрацоўка вац. гымну „Не пагаснуць зоркі ў небе“ не спаткала ў публіцы таго прыняцьця, на якое хіба разьлічваў аўтор.

Зьмяшчаючы пару гэтых скромных заўваг, мы далёкі ад жаданьня камусьці неяк дакучыць: наадварот, адзіным жаданьнем нашым пры гэтым ёсьць пазбавіць у караві ахвярных працаўнікоў над беларускай песь-

W. A.

Kaniok-Harbuniok.

XII.

Ścichła mora—akijan.
Na piasku siadzić Iwan
I hladzić, hladzić na mora.
Łomić ruki sabie z hora,
Stohnie wielmi, narakaje —
Ŭsio čakaje, dy čakaje.
I jahony Harbuniok,
Zakapaŭšysia ŭ piasok,
Dremić tolki, až ziawaje —
Tak-ža niečaha čakaje.
„Wiš, zdajecca, sprawiadliwy,
A pa praŭdzie, dyk falšywy!
I kruciel i ašukaniec,
Jak toj žyd, cyhan, pahaniec:
Abiacaŭ nam, balamuciŭ,
Adnak, bestyja, načmuciŭ!...
Tak woś Janka narakaje,
Dyj usiožtyki čakaje.
Woś i sonca zamaryłaś
I na zachad pachiliłaś:
Skupa świecić, mała hreje;
Tolki mleje, čyrwanieje,
I spawolna asiadaje,
Pośle ŭ mora zapadaje.
Tolki-ž, tolki sonca sieła,
Až tut mora zakipieła:
Ryba-kit, hultaj, maruda
16) Toj wialiki zdradnik-„juda“ |
Raptam wynyrnuŭ z wady.
„Chadzi, Janačka, siudy,“
Kaža: „Skryniu zabiraj;
Dy i sam zdaroŭ bywaj!
Kali budzieš biadawaci,
Ci čaho jašče šukaci,
Dyk da mora prybiažy —
Adno słoŭca mnie skažy,
A ja zara, jak waźmusia,
Dyk jašče raz adsłužusia.“
Tut i skryniu prywałok,
I špurnuŭšy na piasok,
Kaža: „Janka, budź zdaroŭ!“
Sam ža ŭ mih na dno pašoŭ.
Janka plaskaje rukami
I z Kańkom nia znajuć sami,
Što rabić; až prosta skačuć,
To całujucca, to płačuć.
„I ty, kit, bywaj zdaroŭ!“
Janka tut jamu zaroŭ:
„Sto hadoŭ sabie žywi,
Pa usich morach pływi.
Nie rabi adnak zabawaŭ:
Nia hłytaj bolš wadapławaŭ,
Dyk ščaśliwa budzieš žyć,
Jak Illa bahasławić.“
Woś Iwan da skryni ŭsiaŭsia,
Ale jak-ni-jak staraŭsia —
Ci padniać, ci paciahnuć —
Nie parušyŭ ani čuć!
„A kab jon, toj kit, prapaŭ!“
Tak Iwan jaho zaklaŭ:
„Napchaŭ ŭ skryniu niejkaj dreni...
Ci tut trasca, ci kamieńni?“
Kaniok tolki zaśmiajaŭsia,
Zara sam za skryniu ŭziaŭsia:
Nahoj skryniu začapiŭ,
Razmachnuŭsia, zakruciŭ;
U haru jaje padkinuŭ
I ŭzwaliŭ sabie na śpinu.
Janka sieŭ na skryniu wyžej,
Spuściŭ nohi kryšku nižej;
A Kaniok saŭsim padspodam...
I pajšoŭ zwyčajnym chodam.
Najpierš borzdym pašoŭ krokam,
Pośle truchtam pośle skokam;
Pośle, brat, jak razahnaŭsia,
Dyk i ptuškam nie padaŭsia.

XIII.

Dzień čaćwiorty padymaŭsia,
Krasnaj zorańkaj śmiajaŭsia.
Rasoj bujnaj noč spacieła —
Adychodzić nie chacieła.
Woś ad zorki i ad rańnia
Nočki z dniom pajšło zmahańnie:
Sonca stała praciŭ nočy —
Zaświaciła joj u wočy.
Užo dzień chacieŭ być panam—
Noč zakryłasia tumanam.
Zbožža, drewy horka płačuć,
Bo woś soniejka nia bačuć.
Tuman hidki, aharčeły,
Ŭsiudy lezie — taki śmieły!
Pa ziamli sabie kačaŭsia,
Ŭ haru śmieła padymaŭsia;
Staŭ na sonca pasiahaci!
Hrunt adnak-ža zara straciŭ...
Choć jak smoŭž kružyŭ, kidaŭsia,
Na kusočki adnak rwaŭsia;
Staŭ nazojliwy, choć redki,
Astaliś z jaho abjedki.
Dzień wiasioły pakazaŭsia,
Jasnym soniejkam śmiajaŭsia.
Piajuć ptuški prywitańnie —
Ščezła nočy panawańnie!
Woś zahinuŭ Janka niedzie,
Jak hustym tumanam jedzie.
Dy woś sonca zaświaciła,
Stała hinuć nočki siła.
Padjaždžajuć da stalicy.
Widać cerkwy i zwanicy.
Wiazie Konik skryniu, Janku,
Zatrymaliś sierad zamku.
Kniaź tut wybieh na spatkańnie,
Pačałosia prywitańnie:
„Što, piarścionak jość, ci nie?“
„Tut u skryni, až na dnie,“
Kaža Janka. Kniaź padskoča,
Skryniu krucić, padniać choča:
Z miejsca probuje ciahnuć,
Dyj nia moža ani čuć!
Kniaź tut mučycca, złujecca;
Hladzić Janka, dy śmiajecca,
Kaža: „Hetak — mały tołk!
Prykažy paklikać połk,
Bo niaščaściem jak pryciśnie,
Dyk sam čort pad joj nia piśnie.“

(d. b.)

ныя і гэтых найменшых на нашу скромную думку недахопаў.

Усе прысутныя на залі слухачы згодна прызналі паважанаму Рэгенту вялікі талент і незвычайную ў нашы часы самаахвярнасьць, дзякуючы каторай з сырога элемэнту ўмела створаны хор патрапіў здаволіць і вельмі нават пераборлівае ўхо. Прыслужыліся справе і ахвярныя харысты, што двелячыся апошнім часам, з відавочным ушчэрбам для сваіх спраэаў асабістых, пільна прыгатаваліся да ўдалага выступленьня. Шчасьлівым быў таксама помысл жаночай часьці хору апрануцца ўсім у беларускія нацыянальныя касьцюмы.

Пільнасьць і самаахвярнасьць харыстаў належна ацаніла віленскае беларускае грамадзянства, якое бяз розьніцы палітычнай ахварбоўкі, калі толькі ня было занятым, зьявілася на канцэрт. Наагул гэтае выступленьне хору можна азначыць чыста беларускім: як паводле складу хору, так і паводле публікі, дзе апрача газэтных рэпортэраў, нікога амаль з чужынцаў ня было. А гэта значыць, што віленскія беларусы ўжо на гэтульні ўзмацаваліся, што супольнымі (дасловна!) сіламі могуць сьмела пазволіць сабе на чыста-мастацкую імпрэзу, якой выступленьне хору пад кіраўніцтвам грам. Шырмы заўсёды было, ёсьць і пэўне-ж што будзе.

Агульным пажаданьнем усіх беларусаў ёсьць, каб гэткім накладам працы і здароўя наладжаны хор не засыпаў на рав здабытых лаўрах, але каб па гэтай дарозе ішоў далей, пашыраючы красу беларускай песьні як найшырэй і найдалей: дасьць гэта беларусам прызнаньне ў чужынцаў і згоду ў працы паміж сабой, бо **песьня лучыць!**

А. К.

З газэт.

Наіўныя прэтэнсыі.

Сумна — ведамая на віленскім бруку „Скарыніі", звудзіўшыся мусіць сваім адзінотвам, уздумала аднаго ўзноў спрабаваць „шчасьця" і скарыстаць з дзіўнай у апошнім часе гасьцінасьці „дэмократычнага" „Kurjera Wileńskaha" для ўсякіх гастроляў, мэтай якіх ёсьць чарненьне ведамага беларускага дзеяча кс. Ад. Станкевіча, без даваньня гэтаму апошняму магчымасьці належнага барэніня.

Вось-жа п. „прэзэс" „Скарыніі" К. Глінскі падпісаўся аднагдй у ўспомненым „Kur. Wil." № 122 пад „адкрытым лістом" да кс. Станкевіча і ведаючы наперад, што вічога сваім паступкам не дасягне — з „Скарыніяй" сяганьня ніхто з беларусаў не рахуецца, — надрабляе міну „паважнага мэнтора", стараючыся, як і ўся сяньняшняя польска-беларуская угода, — цалую віну за свае няўдачы зваліць на кс. А. Станкевіча і на ім „адпаведна" памсьціцца.

Сэнс гэтага ліста зводзіцца да выгоднага для „Скарыніі" ўздажэньня віны на кс. А. Станкевіча за нашу ў № 21 „Б. Кр." заценку аб нападзе дня 15 м. м. на бел. друкарню ім. Скарыны. Скарынінцы, як відаць, дашукваюцца ў гэтай заценцы свайго ўчасьця ў названым нападзе, грозяць нам за гэта судом і да справы хацелі-б яшчэ „моральна" „прышыць" і кс. А. Ст-ча. — Ня хочам тут дзеля гэтага выпераджаць дэцызыі суду і пакідаем тымчасам на старане гэтае пытаньне. Ня нашай таксама справай ёсьць адказаваць на заченкі „Скарыніі" кіраваныя да кс. Станкевіча. Зазначым толькі, што „выступленьне" п. Глінскага надта-ж прыпамінае прыказку: „Дзе коняў куюць, там жаба нагі не падстаўляй" — дарэмныя захады, бо роўныя самагубству!

Р.

Француска нямецкі саюз проці бальшавікоў? Францускія газэты падаюць, што ў Парыж прыехалі нямецкія палітыкі, як прадстаўнікі новага нямецкага ўраду на перагаворы дзеля заключэньня француска-нямецкага саюзу проціў бальшавікоў.

Проціў саюзу з Польшчай. Францускія газэты апошнімі часамі штораз больш пішуць проціў саюзу Францыі з Польшчай. Надовечы адзін выдатны журналіст зьмясьціў стацьцю ў газэце „Эзр", у якой, выступаючы проціў француска-польскага саюзу, даказвае, што гэты саюз зьвязаны з цэлай зеграніччай палітычнай ар'ентацыяй, якая цяпер павінна быць зьменена.

З беларускага жыцьця.

Ц. К-т Б. Х. Д. аб тактыцы беларускіх угадоўцаў. Віленскі орган беларускай угоды „Беларускі Звон" цэлую сёлетнюю вясну б'е — з уласнага пачыну, ці „на obstalunek" — з усіх сіл і з асаблівай заядласьцяй па заслужаным беларускім дзеячу кс. Ад. Станкевічу, прыпісваючы яговай асобе віну за ўсё, што дамаросным угадоўцам трапілася „нявыгоднага." Форма гэтых нападаў, пераходзячых часта ў звычайны данос, апошнім часам прыняла на гэтульні дзікі характар, што імі займаўся на апошнім сваім паседжаньні прэзыдыум Ц. К-ту Б. Х. Д., які пераслаў нам да апублікаваньня наступнае:

„Выпіска з пратаколу № 3 паседжаньня Прэзыдыуму Ц. К. — Б. Х. Д. дня 30 траўня 1932 г. Газэта „Беларускі Звон", орган польска-беларускай угоды беспрастанна нападаючы на „Бел. Крыніцу" і Б. Х. Д. за іх крытычныя адносіны да польска-беларускай угоды, але аднолькава сваю слабасьць прад арганізацыяй Б.Х.Д.,—выражаныя ў „Бел. Крыніцы" крытычныя адносіны Б.Х.Д. да польска-беларускай угоды прыпісвае асобе кс. Ад. Станкевіча.

Дзеля гэтага Прэзыдыум Ц. К.—Б.Х.Д. сьцьвярджае што:

1) „Беларуская Крыніца" ёсьць органам Б.Х.Д. і рэдагуецца цэнтральнымі яе ўладамі;

2) „Бел. Крыніца" знаходзіцца пад безпасярэдным кіраўніцтвам сябры Ц.К.—БХД. афіцыяльна падпісанага рэдактара;

3) За ідэолёгічны кірунак „Б. Крыніцы" зьяўляюцца адказнымі цэнтральныя ўлады Б. Х. Д.;

4) Кс. Ад. Станкевіч, пасьля ведамай забароны віленскім каталіцкім арцыб. Ялбжыкоўскім належаць ксяндзом да Б.Х.Д. і супрацоўнічаць у „Бел. Крыніцы", вышаў з радоў Бел. Хр. Дэмократыі, пакідаючы на гэтай ніве па сабе вялікія заслугі для Беларускага народу і самой арганізацыі.

Пры гэтым Прэзыдыум Ц. К.—Б. Х. Д. сьцьвярджае так-жа, што БХД. і „Белар. Крыніца" прыпадкова сталіся пасярэдным об'ектам, на якім злая воля беларуска-польскай угоды ў „Бел. Звоне" безпадставна шкаляе паважанага ў беларускім грамадзянстве кс. Ад. Станкевіча за крытычныя адносіны БХД., выражаныя ў „Бел. Крыніцы", да беларуска-польскай угоды.

Дзеля гэтага Прэзыдыум Ц. К. Б.Х.Д. перапрашае кс. Ад. Станкевіча за прыпадак створаны кіраўнікамі „Бел. Звону" на грунце нашых да іх адносінаў, выяўляе сваю гатовасьць да змаганьня чэснага, адкрытага і адкідае ўсякае крўцельства, мэтай якога заўсёды было, ёсьць і будзе хаваньне праўды, замест шуканьня яе і выяўленьня."

Матура ў Віл. бел. гімназіі кончылася дня 7 г. м. Экзаміны на атэстат сьпеласьці здалі абсольвэнты Віл. бел. гімназіі: 1. Л. Асаевічанка, 2. К. Акінчыц, 3. Ю. Бабок, 4. К. Чартовіч, 5. А. Хадзінскі, 6. К. Кот, 7. М. Коўтык, 8. А. Казлоўская, 9. Н. Падагель, 10. Я. Шалешка і 11. Л. Багдановічанка; экстэрнамі здалі экзамін: К. Крук і Л. Стаўбунічанка. — Вітаем!

Матуральная вечарына старарэньем вучняў 7 й клясы Віл. бел. гімназіі адбудзецца ў суботу дня 11 г. м. у залі гімназіі (Вострабрамская 9). Пастаўлена будзе, першы раз у Вільні, „Птушка на волі", сцэнічны абразок у 3-х дзеях з жыцьця вёскі. — Пачатак а 8 ай гадз. увеч.

Культурная праца на вёсцы ў Браслаўскім пав. У мінулым месяцы беларуская моладзь пад кіраўніцтвам вучыцельні прыватнай беларускай школы Бел. Інстыт. Гасп. і Культуры у в. Шаўлянах Браслаўскага пав. М. Булыговай заладзіла тры беларускія прадстаўленьні: — 8.V. у в. Тарасполі, Пагостскай гм., 15.V. у в. Шаўлянах і 19.V. у Барадзенічах, Ёдзкай гм.

З СТУДЭНСКАГА ЖЫЦЬЦЯ.

Пратэстацыйнае студэнскае веча не адбылося. Урад Беларускага Студэнскага Саюзу, з увагі на пагражаючую ліквідацыю беларускага сярэдняга школьніцтва, арганізаваў на дзень 1-га чэрвеня с. г. протэстацыйнае веча беларускага студэнства У. С. Б. Веча аднак не адбылося, бо Куратар В. С. С. праф. Владычка катэгорычна не дазволіў яго склікаць.

Куратар Бел. Студ. Саюзу праф. Ст. Владычка адрокся кураторства. Праф. Владычка, па атрыманьні пэтыцыі, у якой аграмадная большасьць бел. студэнтаў—сяброў Б. С. С. — дамагалася ад яго згоды на скліканьне Звычайнага Сходу Сяброў Б.С.С. на 5-га г. м. з далучаным да пэтыцыі парадкам дзенным, які між іншым зьмяшчаў у сабе і справу адносінаў Б.С.С. да Кл Scorinii і яе сяброў, і ў якой падала матывы непрыміримых адносінаў да Кл Скорыніі і выразіла зацыдаванасьць выкінуць з Б.С.С. сяброў Кл Скорініі належачых да Б.С.С.—дня 31.V.32 г. зрокся свайго кураторства над Б.С.С., матывуючы свае зрачэньне немагай пагадзіць Б.С.С. з Кл Скорыніяй. — Як ніяк, матывацыя зрачэньня даволі арыгінальная...

Х.

З літоўскага жыцьця.

Колькі ў Літве розных арганізацыяў. Паводле апошніх падлічэньняў, у канцы мінулага году, у Літве існавала 4,361 арганізацыя. Ува ўсіх гэтых арганізацыях было 247,089 сяброў. У гэны час 80,050 сяброў належала да арганізацыяў культурных, 46,053 да рэлігійных, 23,066 да дабрадзейных, 16,913 да эканамічных, 15,667 да політычных, 14,734 да лекарска-гігіенічных, 8,403 да цьвярозасьці, 10,965 да розных прафэсыянальных, 8,280 да пажарніцкіх, 6,550 да спартовых і да розных іншых — 654 сябры.

Справа Клайпэды ў трыбунале ў Газе. 8 чэрвеня сёл. г. міжнародны Гаскі Трыбунал прыступіў да разгляду справы Клайпэды. Абаронцам з боку літоўскага выступае Сідзікаўскас, літоўскі пасол у Лёздыне і праўнікі Гражуніс і Робінзон. Свой пагляд на справу Клайпэды літоўскі ўрад выясьніў у адпаведным мэмарыяле, пададзеным трыбуналу. У апрацоўцы гэнага мэмарыялу прымаў учасьце і ведамай славы вучоны законавед з Парыжа праф. Мандэльштам, які так-жа прыбыў на нараду.

*

Два выданьні Літ. Навук. Т-ва ў Вільні: „Lietuviu Tauta" IV кн. і А. Valaičio — „Iš Lietuviu Mokslo Draugijos istorijos".

Запісваньне фонографам літоўскіх мэлёдыяў. Апошнім часам у віленскім унівэрсытэце адыйшлося запісываньне мэлёдыяў літоўскіх народных песьняў пры помачы адумысловага інструмэнту, які завецца фонограф. На працягу васьмі гадзін запісана 45 песьняў, якія пяялі літоўскія сяляне, адумысьлу дзеля гэтага прывезеныя ў Вільню. Фонографам кіруе Дыновскі, кіраўнік этнолёгічнага музэю ў Вільні.

З Польшчы.

Навука мае падаражэць на 100 проц. Газэты падаюць, што міністэрства асьветы апрацавала плян падвышкі платы за навуку ў вышэйшых школах. У некаторых выпадках гэта падвышка мае перавышаць нават 100 проц.

Гэткая падвышка многім студэнтам бедных бацькоў можа прывесьці распачатую навуку, а таксама прад многімі сялянскімі сынамі зачыняе дзьверы да унівэрсытэту.

Палітычныя чуткі. Не зважаючы на заяву старшыні клюбу Б.Б. палкоўніка Слаўка, што ніякіх зьмен у ўрадзе ня будзе, разышліся чуткі, быццам марш. Пілсудзкі намераны даручыць ген. Сосньковскаму тварыць новы ўрад. У гэты ўрад мелі-б увайсьці санацыйныя дзеячы, якія не зьяўляюцца беспасрэдна зьвязаны з справай Бартэля—з конфэрэнцыямі прэм'ераў санацыйных урадаў.

Выбарныя справы ў судзе. Найвышэйшы Суд 6 г. м. разглядаў аж 8 скаргаў на мінулыя выбары ў Сойм і пастанавіў адкладзець разглядваньне гэтых спраў да 20 г. м.

Wypiswajcie kataloh biełaruskich knih: a z jaho abaznačanyja čyrwonym atramantam

knižki pa tannaj canie!

Biełaruskaja Kniharnia „Pahonia"
Wilnia, Zawalnaja wul. Nr. 6.

З заграніцы.

Пералом у нутры Нямеччыны. Найважнейшай падзеяй у сусьветнай палітыцы ў апошнія часы ёсьць пералом у ўкладзе палітычных сіл Нямеччыны.

Упадак ураду Брінінга сьведчыць аб звароце ў нутры Нямеччыны да консолідацыі нямецкіх палітычных сіл дзеля ўзмацненьня Нямеччыны з вонку.

Урад Брінінга трымаўся пры ўладзе дзякуючы даверу прэзыдэнта Гіндэнбуга, ня маючы трывалай большасьці ў падтрыманьні яго ў парляманце (Рэйхстагу). Калі пачалі перамагаць уплывы ў Гіндэнбурга іншыя, а іменна, уплывы групы генэралаў і правіцы — Брінінг падаўся ў адстаўку, а Гіндэнбург, пасьля нарады з прадстаўнікамі парлямэнтарных клюбаў, даручыў стварыць новы ўрад таксама б. сябру каталіцкага „Цэнтру“ (Брінінг так-жа быў сябрам каталіцкага „Цэнтру) фон Папэну.

Пасьля ўтварэньня новага ўраду, адразу насьпела справа роспуску парляманту (Рэйхстагу) і расьпісаныя новыя выбары. Гіндэнбург ідучы па лініі новага кірунку да аб'яднаньня палітычных сіл, выдаў дэкрэт аб роспуску Рэйхстагу і аб вызначэньні новых выбараў на 31 ліпня с. г.

Упадак ураду Брінінга і паўстаньне ўраду, на які мае пераможны ўплыў партыя народных социялістаў (гітлераўцаў), зьяўляецца пераломным часінаю ў новай гісторыі Нямеччыны і дзеля гэтага амаль увесь сьвет з надзвычайным напружаньнем прыглядаецца і сьлядзіць за разьвіцьцём нямецкіх выпадкаў.

Зьмена палітыкі ў Францыі. Апошнія выбары ў францускі парлямант улілі ў жылы францускай палітыкі новай сілы. Як вынік гэтых выбараў —паўстаў там ужо новы ўрад на чале з прэм'ерам Эрріо, які ёсьць сябрам радыкальнай францускай партыі.

Пісьмо ў Рэдакцыю.

Да рэдакцыі часапісі „Бел. Крыніца“

Паважаны Грам. Рэдактар!

Не адмоўцеся зьмясьціць у Вашай часапісі наступнага.

У нумары 16 (41) газэты „Беларускі Звон“ — органе „Цэнтрасаюзу“, ў стацьці „Надзвычайны Агульны Сход Бацькаўскага Камітэту В.Б.Г.“, аўтор, абгаварваючы прапазыцыю гр. Ільляшэвіча аб спыненьні „няслушных напасьцяў“ некаторай прэсы на В.Б.Г., кажа: „Прапазыка была прынята ўсімі галасамі проці двух: п. Ярэміча і гр. Войціка — дзіўная кваліфікацыя (оры двух устрымаўшыхся). Відаць гэтыя паны ня маюць нічога проці агіднае працы розных правакатараў, каторыя падкопываюцца пад гімназію з мэтай яе разбурэньня!... Ганьба ім.“

Галоўныя кіраўнікі Цэнтрасаюзу, як відаць хаця-б з гэтай дзікай рэзалюцыі, так прывыклі да грамадзкай безадказнасьці, так прывыклі лічыць сябе непамыльнымі і сольлю беларускага руху, што ў іх хапіла нахальства ўнасіць гэткую рэзалюцыю — рэзалюцыю згары забясьпечваючую абсолютную безадказнасьць ды нават магчымасьць якой небудзь крытыкі іх дзейнасьці ў межах гімназіі.

Бо й запраўды-ж, ці да гэтае пары было ўсё ў парадку ў гімназіі, ці моральныя кіраўнікі яе стаялі на вышыні сваей годнасьці і ці беларуская прэса, выключаючы некаторыя бязглуздыя аднадвёкі, рабіла „няслушныя напасьці.“ Не! — Праз увесь час кіраўніцтва гімназіяй п.п. Луцкевічам, Астроўскім і кумпаніяй,—кажу кіраўніцтва імі, бо яны былі фактычнымі кіраўнікамі яе,—вялося пляновае дэмаралізаваньне моладзі дзеля сваіх палітычных авантураў, унасілася дэмаралізацыя ў таварыскія адносіны паміж вучнямі і г. д.

Беларуская-ж прэса не вяла „няслушных напасьцяў“ беспадстаўнай лаянкі, грызьні ды бязглуздай сваркі, як гэта тлумачаць „нашы санатары,“ а падавала факты, праўда жудасныя, але факты і то ня ў поўнай іх наготе, каб ня даць варожым колам гімназіі выкарыстаць іх дзеля сваіх мэтаў.

Але ўсё мае свае межы...

Нельга затыкаць падобнымі рэзалюцыямі горла грамадзянству, каб пасьля свабодна тварыць Нікавюксў, а трэба ачысьціць у гімназіі моральную атмосфэру і тады ня прыдзецца „ганьбіць“ тых, якія ўважаюць, што нават найвастрэйшая крытыка, калі слушная — рэч здаровая, хоць і балючая для некаторых асобаў.

Віленская Калёнія
7 чэрвеня 1932 г.

З пашанай
Антон Войцік.

Да нас пішуць.

ЗАКЛАДАЙМА НА ВЁСЦЫ СВАЕ АРГАНІЗАЦЫІ.

Наваградак. Усім нам ужо збрыдлі наракаваньні на цяперашнюю долю. Некаторыя бязрадна апусьцілі ўжо рукі. У многіх прабуджаецца сэнтымэнт да ўсходняга зарубежжа, а ўсе наагул, асабліва моладзь, найбольш цікавіцца социяльнымі і палітычнымі пытаньнямі.

Многія з моладзі зусім расчараваліся ў плоднасьці працы на культурнай ніве, а толькі з надзеяй на некага мрояць аб маючай настаць „роўнасьці, вольнасьці і шчасьці народаў.“

А дзе ж хто бачыў, каб вучоны хацеў мець справу з якім-небудзь даволі дурным Саўкам, каторы зложыўшы рукі дзівіцца з вучонага? Дык мы, беларусы, шляхам працы ў культурных арганізацыях імкнемася да разьвіцьця нашай нацыянальнай культуры; гэтай працай над сабою высунемся шмат наперад і зраўняемся з другімі. Памятайма, што ідэальныя палітычныя клічы трэбуць нацыянальнага пачуцьця народаў.

Разьвіваючы сваю нацыянальную культуру, працай у культурных гуртках, мы ўшануем сваю культуру, а тым і самых сябе. А хто сам сябе шануе, таго і ўсе шануюць. Народ, каторы бязкрытычна пераймае гатовую, чужую культуру і бязмысна яе ўводзіць у жыцьцё, ня прыносіць чалавецтву карысьці. Культурнай працай мы здабудзем „пачэсны пасад між народамі,“ а тагды ў кожнай справе наш голас будзе нешта значыць.

Апрача гэтага гэткай працай мы разаўёмся ўмыслова. А калі ўсё ўпамянутае будзем мець, дык лягчэй нам будзе весьці змаганьне за лепшую будучыню. Дык да працы! М.

НЯ ВАРТЫ ЧЭСЬЦІ.

Наваградчына. У „Беларускай Крыніцы“ за многа пасьвячаецца дарагога месца ўжо добра ведамым сваей угадовасьцяй Луцкевічу і Астроўскаму.

Дзеля таго, што гэтыя людзі ўжо шырока ведамы беларускаму грамадзянству сваей дэструкцыйнай „працай“ у беларускім адраджэньні, а так-жа ведамы і іх натугі скіраваць беларускі адраджэнскі рух на шлях падпарадкаваньня беларускага руху Бэ-Бэкаўскай палітыцы, нявартa аб іх многа пісаць у „Бел. Крыніцы.“ Аб гэтых панох даволі падаць вестку аб іх „новых“ пачынаньнях у палітыцы, дык кожнаму ўжо будзе ясна, што яны стараюцца падысьці з новага боку. Мэта іх ведама ўжо кожнаму. Дзеля гэтага трэба аб іх пісаць як найкарацей і то дробнымі літарамі, дзе ў кутку газэты.

Чай.

АБ НАШЫМ ЖЫЦЬЦІ.

Babaкомшчына, Наваградзкага пав. Старая мода „навабранцаў“ у нас яшчэ не загінула. Кепская і дзікая гэта мода, а палягае яна на тым, што навабранцы б'юцца і б'юць вокны.

Надоўечы ў Новаельню прыяжджала вайсковая камісія і прыймала „навабранцаў.“ На камісію „вадзіў“ з нашай вёскі хлапцоў мясцовы солтыс Палкун. Вяртаючыся дамоў хлопцы заспорылі з солтысам, які таксама, прыпомніўшы маладыя буйныя гады, ўмяшаўся ў „навабранцы“. Вынік быў такі, што і солтыс як „навабранец“ пабіўся з хлапцамі, а ў гэтай бойцы ад удараў „навабранцаў“ павыскаківалі ў хаце солтысавага швагра вокны. Пасьля гэтага солтыс апамятаўся, што ён не „навабранец“ і заявіў у у Наваградзкае стараства, што на яго напалі „навабранцы.“

Дня 6.V. с. г. праходзячы праз нашу вёску паліцэйскі заўважыў, што на вуліцы, пад хатай гутарылі аб нечым пасуседзку сяляне. Паліцэйскі падышоў да сялян і моцным... аргумэнтам загадаў разыйсьціся.

Прайшло ўжо больш дзесятка гадоў, як у нас існуюць польскія школы і польскія арганізацыі, але народ наш на палякоў не перарабіўся.

Як даўней, так і цяпер красуецца ў нас прыгожая беларуская песьня і беларускія народныя звычаі. Апрача гэтага шырыцца кругом беларуская народная сьведамасьць і прагавітасьць асьветы ў роднай мове. Адна бяда ў гэтай справе, што вельмі трудна наладзіць нам культурна-прасьветную працу ў сваей роднай беларускай арганізацыі.

Словам, вёска чакае прыходу культурных беларускіх сіл праз сваю беларускую арганізацыю. Шпак.

МОЛАДЗЬ АХВОЧАЯ, ДА ПРАЦЫ.

Арлянты, Ашмянскага пав. У нас ёсьць гурток Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры. Заргнізаваная ў гуртку моладзь дня 8.V. с. г. зладзіла беларускае прадстаўленьне. Прадстаўленьне ўдалося і вельмі зацікавіла людзей. Пасьля прадстаўленьня многія з моладзі зьявіліся ў гурток Інстытуту з просьбай, каб прынялі іх у гурток, цьвердзячы, што і яны хочуць разам працаваць на ніве беларускага адраджэньня.

Управа гуртка пастанавіла зладзіць чарговае прадстаўленьне 29 чэрвеня с. г.

В. С.

KRYCHU AB ŽYĆCI NAŠAJ STARONKI.

Nowawola, Sakolskaha paw. Čytajučy „Biel-Krynicu“ spatykaju wiestki z usich kutkoŭ našaha kraju — Zach. Biełarusi ab žyćci biełarusaŭ. Ab našaj staroncy dyk ničahusieńki nia čuwać. Dziela hetaha pačnu ab joj pisać ja.

U nas žywuć čyściusieńkija biełarusy, ale jašče takija ciomnyja, što nia čujuć patreby čytać hazety; ab arhanizacyi dyk i hawaryć niama čaho. U nas niama nijakich arhanizacyjaŭ. Narod prosta dzičeje. Ludzi robiacca zajzdrosnyja, a z zajzdraści — imściwyja.

Naša wioska pierajšła na chutary. Prad pierachodam na chutary roznyja pany abiacali, što praz 3 hady wioska nia budzie płacić padatkaŭ, ale heta akazałasia niapraŭdaj, bo jakija padatki byli, takija i jošć dy jašče treba płacić i za kamasacyju.

Sekwestratary biaruć za padatki: karoŭ, koniaŭ, świniej i što papała.

Mnohija našy sialanie siadziać užo biaz chleba, pahladajučy na žytco, jakoje jšče zialonaje. Typiotr

З Вільні.

Беларускі канцэрт у Віленскім г. зв. парку Жэлігоўскага адбудзецца ў сераду дня 15 г. м. а гадзіне 8-ай увечары. Выступае мяшаны бел. хор пад кіраўніцтвам грам. Р. Шырмы.

Віселіца і суд над б. сьледчым судзьдзёй. Надоўечы Віленскі даразны суд засудзіў на кару сьмерці селяніна Малько і двух сялян на дасьмертную катаргу за шпіёнства. Мальку варшаўскі дзяржаўны кат павесіў у Лукішкім вастрозе на спэцыяльна зробленай віселіцы.

Звычайны акружны суд засудзіў за розныя фальшэрствы б. сьледчага судзьдзю Пятровіча — Вутрыма на 2 гады вастрогу.

Матка 15 дзяцей галодная на вуліцы. Гэтымі днямі паліцыя знайшла самлеўшую старуху на вуліцы, якая ледзь сказала, хто яна і што яна некалькі дзён нічога ня ела. Выясьнілася, што гэная старуха мае мужа і 15 дзяцей, але ўся яе сям'я даўно ня мае працы і таксама галадуе.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.